Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Аддзел адукацыі, спорту і турызму
адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Гродна
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Сярэдняя школа №38 г.Гродна»

# Экскурсійнае прадстаўленне “Ручнік – сведка вайны”

**(для ўдзелу ў абласным этапе рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі)**

**Намінацыя “Гісторыя аднаго экспаната”**

**Аўтар: Кізюкевіч Сяргей Дзянісавіч, 13 год**
**вучань VIII “Г” класа, м.т. +375291117662**
**Кіраўнік праекта:**
**Канаплянка Таццяна Уладзіміраўна,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры,**
**м.т. +375333488110**

Гродна,



**2021**

Ручнік – сведка вайны

Мяне завуць Кізюкевіч Сяргей, я вучань 8 “Г” класа сярэдняй школы № 38 г. Гродна. І сёння я хачу вас запрасіць у наш школьны музей “Хрысціянскія каштоўнасці і народныя традыцыі ў сям’і”. Заходзьце, калі ласка!

Наш музей мае чатыры залы. У ім ёсць экспазіцыі, прысвечаныя народнай і сямейнай культуры беларусаў, народнай педагогіцы, гісторыі роднага краю, сімвалам мінулых эпох і сучаснасці. Але асаблівую цікавасць не толькі ў мяне, але ў многіх наведвальнікаў выклікае музейны стэнд, прысвечаны ручнікам.

Саматканыя ручнікі,

Радасць, смутак, бяссонне вёсак.

Размаўляюць са мной вякі,

Пакаленні, людскія лёсы.

Чым жа так заварожваюць гэтыя цудоўныя вырабы народнага мастацтва? Магчыма, тым, што кожны ручнік быў падораны музею канкрэтнымі людзьмі, кожны з іх мае сваю захапляльную гісторыю. На вышыты ручнік клалі дзіця пры нараджэнні, хлебам на ручніку сустракалі гасцей, на яго станавіліся маладыя ў царкве, ручнікі ў якасці абярэгаў вешалі на прыдарожныя крыжы.

Калі падыходзіш да гэтых ручнікоў, яны быццам размаўляюць з табой, быццам напяваюць сваю непаўторную мелодыю.

Мелодыя ручніка… Быццам песня, льецца льняное палатно з вышытымі на ім валошкамі і рамонкамі. Гэта мелодыя ідзе ад сэрца, ад лёсу чалавека, з якім ручнік усё жыццё быў звязаны.

Асабліва мяне ўразіла гісторыя аднаго ручніка, які з’явіўся ў нашым музеі зусім нядаўна, у мінулым годзе. Прынесла яго бабуля аднаго з нашых вучняў, Пятрэвіч Тарэса Уладзіславаўна. Сама чалавек апантаны і заўзяты ідэяй захавання сямейных каштоўнасцей, аднойчы пабываўшы ў нашым музеі, яна

вярнулася да нас з падарункам – ручнікам – і з цікавай гісторыяй пра яго. Але спачатку апішам сам твор народнага мастацтва.

Ручнік уяўляе сабой ільняную саматканую паласу тканіны традыцыйнага белага колеру шырынёй 40 сантыметраў і даўжынёй 1 метр 20 сантыметраў.



Белы колер - гэта сімвал дзённага святла, вады, што наталяе смагу, колер чысціні. Канцы ручніка з двух бакоў упрыгожаны карункамі з выступаючымі вострымі вугламі. На карунках прысутнічае ўзор у выглядзе кветак і ромбаў, якія чаргуюцца. Ромбы, заштрыхаваныя ўнутры, сімвалізуюць узаранае поле і ўраджайнасць зямлі. На канцах ільняной тканіны ручніка зроблены 4 карункавыя ўстаўкі, аздобленыя блакітнымі і аранжавымі ніткамі. Паміж 3 і 4 карункавымі ўстаўкамі прысутнічае ўзор у выглядзе пераплеценых галінак дуба, аздобленых кветкамі каліны. Гэта спалучэнне здаўна лічылася сімвалам незвычайнай прыгажосці і неверагоднай сілы. На такі ручнік-абярэг ускладалася адказная місія ратавання здароўя і жыцця членаў сям'і.

Ручнік гэты, як аказалася, мае доўгую і захапляльную гіторыю. Апавядала яе Тарэсе Уладзіславаўне матуля…

Гэта гісторыя бярэ свой пачатак у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вёска Зарачанка, дзе ў той час жыла маці Тарэсы Уладзіславаўны, яшчэ маленькая дзяўчынка, знаходзілася ў акупацыі, як і ўся наша шматпакутная Беларусь. Немцы ўстанаўлівалі свае парадкі. Напрыклад, у доме святара арганізавалі сваю камендатуру з турмой, дзе трымалі арыштаваных, ні ў чым не павінных людзей. Фашысты лічылі звычайнай з'вай рабаваць мясцовае насельніцтва: забіралі прадукты харчавання, вопратку, каштоўныя рэчы. Людзі хавалі самае

дарагое, дзе толькі маглі. І гаспадыня ручніка, матуля Тарэсы Уладзіславаўны, разам з мамай стала хаваць усе каштоўныя рэчы. Сярод іх аказаўся і наш ручнік, які перадаваўся ў іх сям'і па жаночай лініі здаўна і лічыўся сямейным абярэгам. Гэты ручнік закапалі яны пад яблыняй. Падчас вайны хату спалілі фашысты. Разам з хатай згарэла і яблыня, пад якой быў схаваны ручнік. У пасляваенны час гаспадары адбудоўваліся нанова. Тады яны і знайшлі сямейную рэліквію. Яна доўгія гады захоўвалася ў хаце Тарэсы Уладзіславаўны. Але, пабываўшы ў нашым музеі, яна захацела падзяліцца гэтай гісторыяй з будучымі пакаленнямі. Яна вельмі жадала, каб усе наведвальнікі музея зразумелі на прыкладзе яе сям'і, што гісторыю ніколі нельга забываць, яе трэба захоўваць і берагчы.

Для мяне гісторыя гэтага ручніка не толькі гісторыя асобнай сям'і, а гісторыя нашага роднага краю, яго мужнасці, неўміручасці і самабытнасці. Гэтыя ручнікі, якія ёсць у кожнай беларускай хаце, з'яўляюцца сапраўднымі абярэгамі кожнай асобнай сям'і і цэлай краіны. Магчыма, пачуўшы ў музеі гэтую незвычайную гісторыю ручніка Тарэсы Уладзіславаўны, мы пацікавімся ў сваіх родных, з чым звязана гісторыя стварэння нашых, сямейных ручнікоў, і пачуем ад сваіх бабуль і дзядуль не менш захапляльную гісторыю.

Запрашаем вас абавязкова наведаць наш школьны музей. Ведайце, што кожны экспанат тут жыве сваім жыццём і пра многае можа вам расказаць.